*Рубан Дар'я Святаславаўна,*
Нацыянальная бібліятэка Беларусі,
вядучы бібліёграф інфармацыйна-аналітычнага аддзела;
аспірантка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

## Функцыі і ўласцівасці вучэбнай кнігі для вышэйшай школы

*Аналізуюцца функцыі і ўласцівасці вучэбнай кнігі для вышэйшай школы з улікам характару іх трансфармацыі ва ўмовах удасканалення вышэіішай адукацыі і пераходу да грамадства ведаў. Адзначаеіша, што функцыянальнае прызначэнне вучэбнай кнігі для вышэйшай школы ўтрымлівае тры аспекты: кагнітыўны, арганізацыйны і крэатыўны.*

Па меры ўскладнення задач навучання, развіцця сістэмы сродкаў навучання рабіліся больш разнастайнымі і функцыі вучэбнай кнігі, у першую чаргу — пераразмеркаванне гэтых функцый у складзе сістэмы, і па-другое — з'яўленне новых функцый у цэласнай сістэме інфармацыйна-дыдактычных сродкаў. Сучасная вучэбная кніга знаходзіцца ў працэсе трансфармацыі сваёй сутнасці, функцый, уласцівасцяў, абумоўленым пераходам ад постіндустрыяльнага грамадства да грамадства ведаў, пераўтварэннем, перапрацоўкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукова-тэарэтычных, светапоглядных, мастацка-каштоўнасных, тэхніка-тэхналагічных і іншых ведаў. У гэтай сувязі функцыі ј ўласцівасці вучэбнай кнігі для вышэйшай школы мы будзем разглядаць з пазіцыі кагніталагічнага падыходу.

На неабходнасць глыбокага функцыянальнага аналізу вучэбнай кнігі неаднаразова ўказвалі многія даследчыкі. Дыдактычныя функцыі вучэбнай кнігі — гэта мэтанакіравана сфарміраваныя яе ўласцівасці як носьбіта змссту адукацыі і асноўнага кніжнага сродку навучання, якія найбольш поўна адказвае мэтаваму прызначэнню вучэбнай кнігі ў працэсе рэалізацыі зместу адукацыі [14].

У даследаваннях, прысвечаных тэорыі вучэбнай кнігі, згадваецца да 40 функцый: інфармацыйная, адукацыйная, выхаваўчая, пазнавальная, навукова-даследчая, вучэбна-практычная, сацыяльна-педагагічная, метадычная, стымулюючая, даведачная, самакантролю і інш. [12].

Пытанні аб функцыянальным прызначэнні вучэбнай кнігі абгрунтаваны ў працах У. У. Краеўскага, І. Я. Лернера, Д. Д. Зуева, У. Г. Бейлінсана (вучэбная кніга для агульнаадукацыйнай школы), У. І. Смірнова, С. Г. Антонавай, Л. Г. Цюрынай (вучэбная кніга для вышэйшай школы).

Пры аналізе і ацэнцы вучэбнай кнігі практычна ўсе даследчыкі перш за ўсё ўстанаўліваюць ступень рэалізацыі функцый падручніка, уласцівых усёй сістэме сродкаў навучання. У манаграфіях У. Г. Бейлінсана [2], Д. Д. Зуева [8], С. Г. Шапаваленка [ 15] і ў іншых публікацыях разглядаюцца функцыі падручніка, кожная з якіх і ўсе яны ў комплексе мэтанакіравана працуюць на дасягненне адзінства і найболып поўную рэалізацыю адукацыі. Вучэбнай кнізе, якая з'яўляецца састаўной часткай сістэмы сродкаў навучання, прызначана асаблівая роля ў гэтай сістэме.

У. У. Краеўскі развіў канцэптуальнае палажэнне аб дваістасці функцый падручніка, які з'яўляецца, з аднаго боку, «крыніцай інфармацыі. формай фіксацыі зместу», а з другога — «сродкам арганізацыі працэсу навучання і кіравання дзейнасцю навучання і вучэння» [10, с. 16.]. І. Я. Лернер пагаджаецца з думкай У. У. Краеўскага і адзначае, что падручнік прызначаны і для вучня, і для настаўніка. У настаўніка ён фарміруе педагагічнае ўсведамленне і раскрывае перад ім логіку навучання, служыць дапаможнікам арганізацыі працэсу навучання. Для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучня падручнік — крыніца, змест і інструмент засваення вучэбнага матэрыялу. Тым самым падручнік выступае ў ролі апераджальнага інструмента арганізацыі навучання [11, с. 25].

Праблема функцый вучэбнай кнігі дастаткова глыбока даследавана ў дысертацыі У. І. Смірнова. Вызначэнне дыдактычных функцый вучэбнай кнігі аўтар ажыццяўляе з дапамогай сістэмнага падыходу, які адпавядае сістэмнаму характару аб'екта вывучэння. У. І. Смірноў адзначае, што наяўнасць сістэмы прадугледжвае выяўленне сістэмаўтвараючага фактару, які павінен быць адзінай падставай для класіфікацыі функцый, вызначэння іх узаемасувязі. Даследчык вылучае канстытуцыйныя і службовыя функцыі вучэбнай кнігі, сцвярджае, што асноўнае прызначэнне вучэбнай кнігі для вышэйшай школы складае рэалізацыя адукацыйнай, развіццёвай і выхаваўчай функцый [13, с. 21].

С. Л. Уладзімірава адзначае, што вучэбная кніга мае пэўнае чытацкае і мэтавае прызначэнне, і асноўнай яе функцыяй у працэсе навучання студэнтаў, у першую чаргу, з'яўляецца забеспячэнне іх самастойнай работы [3].

Вынікі даследаванняў вышэйзгаданых аўтараў паказваюць, што даследчыкі не прыйшлі да адзінага меркавання наконт функцый вучэбнай кнігі, імі па-рознаму інтэрпрэтуюцца інфармацыйная, адукацыйная, выхаваўчая, пазнавальная і іншыя функцыі. Мэтай нашай работы з'яўляецца даследаванне функцый і ўласцівасцяў вучэбнай кнігі для вышэйшай школы з улікам характару іх трансфармацыі ва ўмовах пераходу да грамадства ведаў.

Функцыянальны аналіз неабходны не толькі для вызначэння ролі, педагагічнага патэнцыялу, месца вучэбнай кнігі для вышэйшай школы ў сістэме сродкаў навучання, але і для ацэнкі яе эфектыўнасці, выяўлення асноўных тэндэнцый развіцця вучэбнага кнігавыдання для вышэйшай школы.

Наколькі прадуктыўная вучэбная кніга, закліканая фарміраваць творчыя здольнасці асобы, забяспечваць базавымі ведамі і навыкамі, неабходнымі для развіцця ва ўсіх навучэнцаў магчымасцяў і патрэбнасцяў абнаўляць свае веды на працягу ўсяго жыцця? Можа быць, сёння найбольш апраўданыя падручнікі з жорсткімі рацыянальнымі праграмамі, кароткімі навучальнымі тэкстамі (у традыцыйнай або мультымедыйнай форме) без «лішніх лірычных адступленняў»? У педагагічнай практыцы сустракаецца меркаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб правамернасці двух арыенціраў навучальнага працэсу (а значыць, дзвюх методык вучэбнай кнігі). Адзін арыенцір — на студэнтаў са сваім ладам каштоўнасцяў, якія патрабуюць перадачы «карысных ведаў» найбольш тэхналагічным спосабам і ацэньваюць навучальны курс з пазіцыі эканамічнай мэтазгоднасці (жадаючы ведаць, які рынкавы прадукт можна з гэтага атрымаць). Такім студэнтам патрэбны падручнікі, якія даюць рэгламентаваныя ўменні і навыкі, фактычныя веды. Іншы арыенцір навучальных выданняў — на студэнцкую эліту, гатовую сачыць за рухам навуковай думкі, здольную да далейшага асэнсавання і творчасці [6, с. 122], Думаецца, што для вышэйшай адукацыі гэта проціпастаўленне адназначна нспрымальнае. Адукацыя ёсць не сфера адукацыйных паслуг, але спосаб развіцця, самавыяўлення творчай асобы. Вучэбная кніга для вышэйшай школы, як правіла, не мае на мэце механічную перадачу ведаў і ўменняў, а фарміруе крытычныя і творчыя кампаненты пазнання.

Паняцце «функцыі кнігі» — цэнтральнае ў сістэме кніжнай дынамікі — выяўляецца фактарамі змен, якія адбываюцца ў чалавеку, грамадстве ў сувязі з уздзеяннем на іх кнігі ў працэсе яе функцыянавання. Функцыі кнігі абумоўлены зменамі, рэакцыяй, ператварэннямі, пераўтварэннямі, якія адбываюцца ў выніку яе функцыянавання. Яно ахоплівае і ўласна працэс чытання кнігі, і функцыянальныя характарыстыкі яе элементаў і кнігі ў цэлым [7],

Абапіраючыся на канцэптуальную сістэму кніжнай дынамікі, адносна вучэбнай кнігі для вышэйшай школы можна гаварыць пра кагнітадынаміку вучэбнай кнігі.

Кагнітадынаміка — гэта раздзел кагніталогіі, які толькі пачынае сваё існаванне. Напрыклад, тэма «крытычная і творчая кампаненты пазнання» — гэта і ёсць тэма кагнітадынамікі. «Проста кажучы, кагнітадынаміка — гэта і ёсць сапраўдная навука аб пазнанні (веды ў дынаміцы — гэта і ёсць пазнанне)» [9],

Паняцце кагнітадынамікі вучэбнай кнігі заснавана на вывучэнні функцыянальных уласцівасцяў вучэбнай кнігі і яе функцыянавання ў сістэме вышэйшай адукацыі.

Зыходзячы з вызначанага намі паняцця вучэбнай кнігі для вышэйшай школы (дакументаваная частка інфраструктуры ведаў, адэкватная сучасным задачам кагнітыўнай і арганізацыйнай апрацоўкі інфармацыі ў адукацыі, якая фарміруе крытычныя і творчыя кампаненты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазнання), мы выдзяляем спецыфічныя функцыі вучэбнай кнігі для вышэйшай школы.

***Кагнітыўная функцыя*** вучэбнай кнігі сёння рэалізуецца ва ўмовах, калі ўзрастае аб'ём вучэбнай інфармацыі, што патрабуе рацыянальнага яе адбору з выдзяленнем асноўнай базавай часткі і дадатковай інфармацыі. Кагнітыўная функцыя вучэбнай кнігі накіравана на фарміраванне кагніталагічнай культуры будучага спецыяліста, што дазволіць авалодаць вялікім і разнастайным патокам інфармацыі, даць крытычную ацэнку, змястоўную сарціроўку і фільтрацыю інфармацыі на прадмет яе дакладнасці, карыснасці, сацыяльнай значнасці і крэатыўнасці і такім чынамператварыць яе ў веды. Гэта дазволіць здзейсніць яе эфектыўнае выкарыстанне ў адукацыйным працэсе і арганізацыі навуковых даследаванняў, а таксама практычна ў любым выпадку зрабіць усвядомлены выбар у пэўных праблемных сітуацыях.

***Крэатыўпая функцыя:*** вучэбная кніга для вышэйшай школы выступае ў якасці сродку творчай рэалізацыі асобы чалавека. У працэсе вывучэння і даследавання розных з'яў прыроды і грамадства будучы спецыяліст фарміруе ўласны свет прадметаў і каштоўнасцяў, і пры гэтым ён ажыццяўляе вялікія творчыя намаганні. Адбываецца развіццё творчага мыслення, крэатыўнасці, пашырэнне творчага патэнцыялу, што дазволіць генерыраваць менавіта тыя ідэі, якія прыводзяць да жаданага выніку.

***Вучэбна-даследчая*** функцыя рэалізуецца праз набыццё ведаў, уменняў і навыкаў, якія спрыяюць фарміраванню творчых здольнасцяў і асваенню прынцыпаў правядзення навуковых даследаванняў, а таксама непасрэднае ўключэнне ў навукова-даследчую дзейнасць

***Функцыя інтэграцыі***: вучэбная кніга павінна забяспечваць рэалізацыю адукацыйнай, развіццёвай, выхаваўчай функцый.

*Адукацыйная функцыя* традыцыйна арыентавана на фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў, поглядаў, перакананняў, а таксама пэўны ўзровень пазнавальных здольнасцяў і практычнай падрыхтоўкі.

*Развіццёвая функцыя*: вучэбная кніга садзейнічае развіццю мыслення, памяці, маўлення, увагі, дазваляе падняцца на новыя ступені інтэлектуальнага і асабістага развіцця. Асноўная роля тут адводзіцца самаадукацыі. Вучэбная кніга, выкарыстоўваючыся ў працэсе самаадукацыі, арыентуе будучага спецыяліста на паглыбленне і пашырэнне ведаў, фарміруе патрэбнасць у самаадукацыі, тлумачэнні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

розных з'яў і працэсаў, здзяйсненні прагнастычнай дзейнасці, стварэнні новых ведаў.

***Выхаваўчая функцыя*** вучэбнай кнігі для вышэйшай школы накіравана на фарміраванне навуковых уяўленняў аб свеце і самім сабе, што садзейнічае развіццю пэўных якасцей і ўласцівасцей асобы, яе светапогляду. Выхаванне творчай асобы — адна з галоўных задач вышэйшай школы. ВНУ імкнецца сфарміраваць у маладога спецыяліста навуковы светапогляд, садзейнічаць выпрацоўцы такіх метадалагічных навыкаў, якія дазволяць яму ў будучым папаўняць і абнаўляць свае веды, а таксама працаваць ва ўмовах недастатковай інфармацыі [5].

***Інтэрпрэтацыйная функцыя***: вучэбная кніга не толькі падае вучэбна-навуковую інфармацыю, але і тлумачыць яе, што дазваляе ажыццявіць працэс пераўтварэння інфармацыі ў веды.

***Арганізацыйная функцыя.*** вучэбная кніга дае ўяўленне аб арганізацыйных формах, метадах і сродках навучання.

Такім чынам, функцыі вучэбнай кнігі для вышэйшай школы працуюць на развіццё пазнавальнай, эмацыянальнай сферы, фарміраванне творчай асобы. Ва ўмовах трансфармацыі асноўныя функцыі вучэбнай кнігі змяняюцца на ўзроўні зместу, аднак па сутнасці застаюцца нязменнымі: гэта ўзаемазвязаныя адукацыйная, развіццёвая і выхаваўчая. Спецыфіка гэтых функцый для канкрэтнай вучэбнай кнігі вызначаецца асаблівасцямі галіны, адукацыйнай і навуковай дзейнасці вышэйшай школы. Небходна адзначыць, што функцыянальнае прызначэнне вучэбнай кнігі для вышэйшай школы ўтрымлівае тры аспекты: кагнітыўны, арганізацыйны і крэатыўны.

Звяртаючыся да вывучэння ўласцівасцяў вучэбнай кнігі для вышэйшай школы, неабходна канстатаваць, што азначаная праблема даследчыкамі амаль не разглядаецца, за выключэннем вучэбна-метадычнага дапаможніка А. А. Грачыхіна і Ю. Г. Дрэўса [4]. Аўтары выдзяляюць лагічныя і пазалагічныя (прагматычныя) уласцівасці вучэбнай кнігі. Сярод лагічных аўтары называюць такія ўласцівасці, як абстрактнасць, доказнасць, дакладнасць, мадальнасць, абгрунтаванасць і інш.; да прагматычных адносяць выразнасць, даступнасць, інварыянтнасць, арыгінальнасць, арганічнасць, складанасць і інш.

Уласцівасці вучэбнай кнігі для вышэйшай школы абумоўлены яе функцыямі. Іх таксама мэтазгодна разглядаць як паняцце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кагнітадынамікі вучэбнай кнігі. Грунтуючыся кагніталагічным падыходам, мы вылучаем асноўныя характэрныя ўласцівасці вучэбнай кнігі для вышэйшай школы: структуруемасць, інтэрпрэтаванасць, злучанасць і актыўнасць.

Пад структуруемасцю разумеецца наяўнасць у прыродзе вучэбнай кнігі складаных структур, якія адлюстроўваюць як фармальную іерархію (частка — цэлае, тып — род—від), так і змястоўныя адносіны паміж структурамі. Гэта ўласцівасць звязана ў першую чаргу з відатыпалагічнай разнастайнасцю вучэбнай кнігі, калі кожны від мае свае дамінуючыя функцыі, што вызначае іх ролю і месца ў працэсе навучання. У той жа час асобныя віды вучэбнай кнігі з'яўляюцца яе часткай, у сваю чаргу сама вучэбная кніга — частка інфраструктуры ведаў.

Інтэрпрэтаванасць азначае магчымасць змястоўнага тлумачэння ведаў, якія кумулююцца ў вучэбнай кнізе у тэрмінах адпаведнай прадметнай галіны.

Звязанасць (злучанасць) адлюстроўвае адзінства мноства ведаў аб'ектыўнага свету, заключаных у вучэбнай кнізе.

Актыўнасць выяўляе ролю вучэбнай кнігі не толькі як вынік пазнання, але і як прычыны, такога элемента, які ініцыіруе гэты працэс: супярэчнасць або няпоўнасць ведаў часта стымулююць працэсы набыцця або стварэння новых ведаў.

Такім чынам, неабходна адзначыць трансфармацыю зместу вядучых функцый вучэбнай кнігі для вышэйшай школы ва ўмовах пераходу да грамадства ведаў і ўдасканалення сістэмы вышэйшай адукацыі. Аналізуючы функцыі вучэбнай кнігі для вышэйшай школы, мы вызначылі, што яе функцыянальнае прызначэнне ўтрымлівае тры аспекты: кагнітыўны, арганізацыйны і крэатыўны. Паняцце кагнітадынамікі вучэбнай кнігі заснавана на вывучэнні ўласцівасцяў вучэбнай кнігі і яе функцыянавання ў сістэме вышэйшай адукацыі. Спецыфічныя функцыі і характэрныя ўласцівасці вучэбнай кнігі для вышэйшай школы дазваляюць больш поўна зразумець сутнасць вучэбнай кнігі ў сучасных умовах.

***Літаратура***

1. *Антонова, С. Г.* Современная учебная книга: создание учебной литературы нового поколения / С. Г. Антонова, Л. Г. Тюрина. — М. : Издательский сервис, 2001. — 288 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Бейлинсон, В. Г.* Арсенал образования: характеристика, подготовка, конструирование учебных изданий / В. Г. Бейлинсон. — М. : Книга, 1986, — 286 с.

3. *Владимирова, С. Л.* Некоторые тенденции развития культуры вузовской книги / С. JТ. Владимирова // Книжная культура: Опыт прошлого и проблемы современности : К 250-летию вузовского книгоиздания в России : материалы Междунар. науч. конф., Москва, 20-21 сент. 2006 г. / сост. Д. Н. Бакун, А. Ю. Самарин. — М. : Наука, 2006. — С. 62-65.

4. *Гречихин, А. А.* Вузовская учебная книга : Типология, стандартизация, компьютеризация : учеб.-метод, пособие в помощь автору и редактору / А. А. Гречихин, Ю. Г. Древе. — М. : Логос ; Моск. гос. ун-т печати, 2000. — 255 с.

5. *Долженко, О.* Учебник для вуза: каким ему быть? / О. Долженко // В мире книг. — 1980. — № 1. — С. 16-18.

6. *Дулатова, А. М.* Гуманитарный учебник для высшей школы: вопросы трансформации / А. М. Дулатова // Книжная культура : Опыт прошлого и проблемы современности : К 250-летию вузовского книгоиздания в России : материалы Междунар. науч. конф., Москва, 20-21 сент. 2006 г. / сост. Д. Н. Бакун, А. Ю. Самарин. — М. : Наука, 2006. — С. 121-123.

7. *Ельников, М. П.* Феномен книги (Теоретико-гносеологический аспект) // Книга. Исследования и материалы : сб. 71 / Российская книжная палата ; сост. А. П. Толстяков. — М. : Терра, 1995. — С. 37-68.

8. *Зуев, Д. Д.* Школьный учебник / Д. Д. Зуев. — М. : Высшая школа, 1983. —240 с.

9. *Копылов, М. Ю.* Когнитология / М. Ю. Копылов // Немного истории [Электронный ресурс]. — 2002. — Режим доступа : http://cognitology.narod. in history/history.htm. —Дата доступа : 12.02.2011.

10. *Краевский, В. В.* Определение функций учебника как методологическая проблема дидактики / В. В. Краевский // Проблемы школьного учебника. — М., 1976, —Вып. 4 . — С. 11-19.

11. *Лернер, И. Я.* О дидактических основаниях построения учебника / И. Я. Лернер // Проблемы школьного учебника. — М., 1991. — Вып. 20. — С. 23-31.

12. Методические рекомендации авторам учебно-методической литературы, необходимой для реализации обучающе-исследовательского подхода при подготовке специалистов / В. В. Свиридов, Т. П. Каратаева, Е. И. Василевская, К. В. Логинова // Рэалізацыя навучальна-даследчага прынцыпу у сістэме шматузроўневай універсітэцкай адукацыі : зб. навук.-метад. матэрыялаў / Бел. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка; пад. рэд. Ю. А. Быкадорава. — Мінск, 2000. — С. 18-37.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Смирнов, В. И.* Учебная книга в системе дидактических средств / 0 И. Смирнов // Университетская книга. — 2001. — № 11. — С. 20-26.

14. *Сможенкова, М. С.* Дидактические основы разработки учебно-методического комплекса для профессиональной подготовки специалистов в сфере туризма : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.08 / М. С. Сможенкова. — Сходня, 2001. —397 л.

15. *Шаповаленко, С. Г.* Учебник в системе средств обучения / С. Г. Шаповалеко. — М. : Просвещение, 2003. — 255 с.

***Summary***

*The functions and properties of a textbook for a high school considering the nature of their transformation in conditions of the higher education improvement and the conversion to an educated society are analyzed. It is mentioned that the functional purpose of the textbook for a high school includes three aspects: cognitive, organizational and creative.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ